**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**

**“Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа Ельскага раёна”**

# Віктарына

# “Знаўцы  традыцый беларускага народа”

**(для вучняў 1 – 4 класаў)**

Распрацавана і праведзена
настаўнікам пачатковых класаў
Любінай Аленай Аляксандраўнай
дзяржаўнай установы адукацыі
“Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа
Ельскага раёна”

**Рамязы**

**Мэта:**

- замацоўваць і пашыраць веды аб традыцыях беларускага народа;
- стварыць умовы для развіцця памяці, уяўлення, звязнай вуснай мовы, камунікатыўных уменняў, пазнавальнай актыўнасці вучняў;
- спрыяць выхаванню павагі да традыцый беларускага народа, цікавасці да вывучэння гісторыі роднай краіны.

**Абсталяванне:** карта падарожжа, карткі з заданнямі, дыпломы для пераможцаў, мультымедыйны праектар, прэзентацыя “Замкі Беларусі”, відэакліп песні “Беларусь”.

**Літаратура:** “Спадчына маёй краіны” І.К.Грышкевіч, часопіс “Пачатковая школа” №10 2013 год.

**Ход віктарыны**

**1. Пастаноўка тэмы і мэты віктарыны.**

- Мы – беларусы, наша краіна, у якой мы жывём – Беларусь. Кожная краіна, кожны народ адрозніваецца ад іншых мовою, звычаямі, вопраткай, знешнім выглядам. Мы, беларусы, таксама адрозніваемся ад людзей іншых нацыянальнасцей. Ці ведаеце вы традыцыі, звычаі, святы нашага народа? Вось аб гэтым мы і будзем сёння гаварыць. Канечне ж, у вас ёсць многа ведаў, таму я прапаную вам спаборніцтва. Нам патрэбна тры каманды. Кожная каманда зараз выбірае свайго камандзіра і прыдумвае сабе назву.
- А цяпер дазвольце прадставіць вам наша шаноўнае журы.
- Пара адпраўляцца ў падарожжа па нашай незвычайнай краіне. І для гэтага ў нас ёсць карта падарожжа. На ёй адзначаны прыпынкі, якія мы будзем рабіць.

**2. Першы прыпынак “Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь”.**

- Мы выканаем камп’ютарныя заданні: расфарбуем сцяг Рэспублікі Беларусь, пазнаем герб і гімн.

Назавіце краін-суседак Беларусі.

Мяжуе з Польшчай, Украінай,

Расіяй, Латвіяй, Літвой

Твой родны край, твая Айчына,

Жыццё тваё і гонар твой.

І ты яе запомні імя,

Як неба, сонца і зару.

Твая зямля, твая Радзіма

Названа светла — Беларусь.

(Ю. Свірка.)

**3. Другі прыпынак "Прыродныя багацці Беларусі".**

- Чалавек і лес – спрадвечныя сябры. Жыццё беларусаў без лесу немагчыма. Лес – гэта і ежа, і дом, і свежае паветра. А што для вас – лес.

- Зараз праверым, як вы ведаеце дрэвы нашага лесу.

Мной дзяўчынак называюць.

А як толькі зацвітаю –

З гудам рупным і вясёлым

Да мяне лятаюць пчолы. (Ліпа.)

На снезе пушыстым

Царыца стаіць

У гронках агністых

Ззяе, гарыць. (Рабіна.)

І ў сто гадоў я малады,

Маё насенне - жалуды. (Дуб.)

Зялёная, ды не трава,

Белая, ды не снег,

Прыгожая, ды не дзяўчына. (Бяроза.)

Маўклівая, зялёная,

На ўзгорку стаіць.

Як ветрык падзьме –

Яна зашапаціць. (Асіна.)

Дрэва – я. І я з табой

Мы даўно знаёмыя.

І вясной, і зімой

Я стаю зялёная. (Елка, сасна.)

У бары майго дзяцінства

Льецца птушак звонкі грай,

Дыхай водарам смалістым

І душою спачывай. А. Дзеружынскі.

- Ці ведаеце вы птушак, якія жывуць у нашых лясах?

Ваша задача – пазнаць птушку па апісанні.

- Маленькая, рухомая птушка. Спінка цёмна-карычневая, грудка шэрая, на галоўцы чорная шапачка. (Верабей.)

- Гэта птушка скача з галінкі на галінку, вывучае кожны кусцік. Сама маленькая, спінка чорная, грудка жоўтая. (Сініца.)

- Птушка жыве ў лесе, дзяўбе кару дрэў. На галоўцы чырвоная шапачка, сама markdown рознакаляровая. Яе яшчэ завуць лясным доктарам. (Дзяцел.)

-Прапаную ўсім разам пагуляць у гульню “Верабей”.

Дзеці становяцца ў кола – пасярэдзіне – “верабей”. Карагод спявае песню:

Як пайшоў верабей па суметнічку.

Раскідаў, разбіваў усю сямеечку.

Многа нас, многа нас на зямлі, на хлебе.

Пасля гэтых слоў дзеці разбягаюцца, а “верабей” іх ловіць. Каго зловіць, той становіцца “вераб’ём”.

**4. Трэці прыпынак “Вытокі народнай мудрасці”.**

“Адгадай казку.”

- Думала Лісіца на цэлы дзень наесціся, але нават і пакаштаваць не прыйшлося. (“Лісіца і Журавель”.)
- Прынесла курачка сена карове. Карова з’ела сена і дала масла. (“Як курачка пеўніка ратавала”.)
- Вось пайшоў раз кот у лес на паляванне і заблудзіўся. Шукаў-шукаў дарогу дадому – не знайшоў. Сеў пад ялінкай і плача. Бачыць – лісічка ідзе. (“Як кот звяроў напалохаў”.)

“Працягні прыказку.”

- Век жыві, век … (вучыся).
- Усюды добра, а дома … (лепш).
- Увосень плача, хто ўвесну … (скача).
- Малая пчала, ды і тая … (працуе).
- За родны край галаву … (аддай).
- Без хлеба няма … (абеда).

“Конкурс скорагаворак.”

- Пёк Пракоп-хлебапёк Пятру пернік і пірог.
- Каток нітак клубок закаціў у куток.
- Пракоп і Барыска елі барбарыскі.

\- Давайце адпачнём і пагуляем у гульню “Лён”.

Выбіраецца лён. Астатнія становяцца каля яго, утвараючы круг. Ільну завязваюць вочы. Дзеці ідуць карагодам і прымаўляюць.

Дзеці: Сядзеў лён пад коранем,

Сядзеў малады пад дубовым.

Цёпла табе, лён, ці холадна?

Лён: Ні цёпла, ні холадна.

Дзеці: А хочаш, лён, быць у пары?

Лён: Хачу!

На сярэдзіну выбягае дзяўчынка. Лён ловіць яе. Калі дзяўчынка далёка ад яго, дзеці пачынаюць лічыць: “Раз! Холадна!”, калі блізка – “Раз! Цёпла!”. Лічэнне працягваецца да дзесяці. Калі за гэты час лён не зловіць дзяўчынку, ён зноў водзіць, калі ж зловіць, ролю льну выконвае дзяўчынка, якая ловіць наступнага хлопчыка.

**5. Чацвёрты прыпынак “Старажытныя пабудовы”.**

- Беларусь называюць краінай замкаў. Якія вы ведаеце старажытныя замкі Беларусі?

Прагляд прэзентацыі “Старажытныя замкі Беларусі”.

- Мая айчына —
Поле, нівы,
Над Нёманам зялёны гай,
Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы —
Ўся Беларусь ад краю ў край.
Люблю яе бары, азёры...
Ды як бы іх ні шанаваў,
Калі б не знаў другіх прастораў, —
Напэўна б я засумаваў.

- Амаль усе пабудовы ў беларускай вёсцы рабілі з дрэва, у асноўным з асіны, елкі, дуба. Дамы маглі прастаяць 100-150 гадоў. Забаранялася выкарыстоўваць у будаўніцтве дрэвы, паваленыя бурай. Асаблівая ўвага надавалася выбару месца для жылля. Звычай не дазваляў будаваць хату на скрыжаванні дарог, на тым месцы, дзе раней стаяла лазня, на тым месцы, дзе было здзейснена забойства. Пасля будаўніцтва хаты адбывалася наваселле – вялікае сямейнае свята. Напярэдадні запрашалі святара, які акрапляў новую хату вадой. На ноч перад засяленнем у хату пускалі пеўня ці кошку.Пры пераходзе ў новую хату з сабой бралі агонь з печы ці гаршчэчак з вуголлем, абразы, дзяжу, у якой замешвалі цеста для хлеба.

- У хаце многа месца займала печ. У вуглу каля печы знаходзіўся качарэжнік – месца, дзе стаялі вілкі для чыгуноў, качарга, чапяла, венік. Над печчу замацоўвалася жэрдка, на якой сушылі адзенне. Супраць печы размяшчаўся гаспадарчы кут. Там стаяла кадушка для вады, драўляныя вёдры, даёнка, апалушкі, сальніца. Над лавай на сцяне вісела кухонная паліца з посудам, побач – лыжнік. Каля самых дзвярэй на круку вісела паўсядзённая верхняя вопратка. Каля вугла печы знаходзіўся конь, што служыў апорай для спальнага памоста, на якім ляжалі саламяны матрац, падушкі, пасцілкі. Вышэй, на ўзроўні лежака печы, былі ўладкаваны палаці. Ніжэй вокнаў, уздоўж сцен, уладкоўвалі шырокія лавы. На скрыжаванні лаў, на покуці, ставілі хлебную дзяжу. Покуць – найбольш шаноўнае месца ў хаце. На покуці развешвалі абразы, убраныя ручнікамі, пучкі асвечаных траў. На покуці стаяў засланы абрусам стол, на ім звычайна пакідалі хлеб, накрыты ручніком. Асвятлялася хата лучынай, якая замацоўвалася ў спецыяльным прыстасаванні – лучніку. Пазней сталі выкарыстоўваць драўляныя ложкі, канапы, крэслы, табурэты. Ля сцяны стаяў куфар для адзення, які быў дэкаратыўна аздоблены. Істотную ролю ў афармленні інтэр’ера адыгрывалі посцілкі, дываны, абрусы, ручнікі.

І елі дружна, не драмалі,
Нарэшце ўсе па скварцы бралі.
Як верашчака ў дно спадала,
То маці есці пакідала
Ды ішла ў каморку па другое,
Яшчэ больш смачнае, ядкое
І тарабаніла сюды
Для заканчэння ўжо яды
Тварог, запраўлены смятанай
(Несла з вялікаю пашанай.) Я.Колас.

- А што яшчэ часцей за ўсё елі нашы продкі? Ці змаглі б вы прыгатаваць беларускую страву? Зараз мы гэта праверым.

- З прапанаваных вам прадуктаў: бульба, морква, капуста, сала, малако, мука, мяса, цукар, яйкі, соль – выберыце тыя, якія патрэбны вам для прыгатавання страў: калдуны, яешня, зацірка.

**6. Пяты прыпынак “Беларускія народныя святы”.**

- Мы з вамі ведаем многа беларускіх народных святаў. Зараз паспрабуем скласці гадавое кола беларускіх народных святаў.

Зіма: Каляды, Шчадруха, Стрэчанне.

Вясна: Масленіца, Сарақі, Вялікдзень.

Лета: Купалле, Сёмуха.

Восень: Жніво, Пакровы, Дзяды.

- Раскажыце пра вядомыя вам традыцыі святкавання Каляд, Вялікдня, Купалля.

- Давайце пагуляем у гульню “Зелена”. У гэтую гульню гулялі на Сёмуху ці Троіцу.

Усе становяцца ў круг, бяруцца за рукі і гавораць:

Зелена, зелена, гоп,

Царыца зелена,

Абярніся, Маруся, ты.

Пры слове “гоп” прысядаюць. Маруся пасля апошніх слоў паварочваецца спіной у круг. Так прыгаворваюць кожнаму. Гульня працягваецца пакуль усе не павернуцца спіною ў круг.

**7. Падвядзенне вынікаў віктарыны.**

- Добра вы адказвалі, добра вы гулялі,

І за гэта вам журы дыпломы падрыхтавалі.

Журы падводзіць вынікі віктарыны, узнагароджвае пераможцаў.

- На свеце існуе такая краіна,

Дзе хвоі ажно дасаюць аблачыны,

Дзе рэкі, азёры ў суседстве з лясамі

Напоўнены салаўёў галасамі.

У гэтай краіне ўзгоркі, раўніны

Ўлетку пакрыты густой зелянінай.

Ляночак цвіце з небам сінім у згодзе.

Тут песні і казкі з легендамі ходзяць.

Сяброў дарагіх запрашаем у госці.

Тут людзі не схільныя крыўдзіць кагосьці.

У гэтай краіне ля хатаў буслянкі,

А ў хатах пяшчотна гучаць калыханкі.

Радзімаю нашай край гэты завецца.

Хай нашай Радзіме шчаслiва жывецца! В.Жуковіч.

- А закончыць наша падарожжа мне хочацца прыгожай песняй “Беларусь”.